УДК 882.6-09+378.01

Т. М. Федарцова, дацэнт

# АСАБЛІВАСЦІ ПАРАЎНАЛЬНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «ВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА»

The article shows possibilities of using innovative teaching technologies in the comparative course of Belarusian and world literature.

Вывучэнне слоўнага мастацтва ў беларускіх вну на сучасным этапе патрабуе пэўных карэктываў, бо некаторы час, згодна з тэорыяй сацрэалізму, творы айчынных і замежных аўтараў разглядаліся з пазіцыі народнасці, а не з пазіцый эстэтычнай вартасці і глыбіні філасофскай думкі, як гэта рабілася ў сусветным літаратурным працэсе. Праслаўляючы метад сацрэалізму як адзіны правільны для выхавання грамадства ў духу камуністычных ідэалаў, тагачасная літаратурная крытыка прапагандавала аксіялогію як філасофскае вучэнне аб маральных і эстэтычных каштоўнасцях сацыялістычнага грамадства. І часам адмоўна ставілася да набыткаў сусветнага літаратурнага працэсу. Напрыклад, пэўны час пад забаронай знаходзіліся фасмагарычныя, глыбока філасофскія творы Франца Кафкі, які выступіў наватарам стварэння літаратуры «жаху існавання “маленькага” чалавека на пабытовым узроўні». Але ж містычныя метамарфозы і разуменне «святога праз жудаснае», інфернальнае (матыў пякельных пакут) напаўняюць не толькі яго творы, але і творы выбітнага беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага. Чаму ж не параўнаць містычнае светаадчуванне ў «Ператварэнні» Кафкі і «Што яно?» Гарэцкага і на прыкладзе гэтых твораў паказаць развіццё гатычнай прозы? Але ж гатычнае звязана з боскім, а ў час ваяўнічага атэізму ці магчыма было разважаць пра тэалагічныя ідэі. Прасцей было выключыць з навучальнай праграмы і творы Гарэцкага. Таму стварылася сітуацыя, калі аксіялагічны фактар у савецкім слоўным мастацтве быў зведзены да вузка ідэалагічных мэтаў. А сусветны літаратурны працэс яшчэ з XIX ст. актыўна развіваў кампаратывістыку і незалежна ад месца і часу стварэння твора вылучаў яго агульныя і спецыфічна нацыянальныя адметнасці.

Сёння параўнальнае літаратуразнаўства як адзін з інавацыйных метадаў уведзены ў методыку выкладання літаратуры. Ён дае неабходнасць адкрыцця новых магчымасцей пазнання існасці вакол сябе і ў саміх сябе з дапамогай адкрыцця шматлікіх нявычарпаных магчымасцей і нявытлумачанага да канца цэласнага гарманічнага мастацтва прыгожага слова.

Студэнтам-выдаўцам на практычных занятках па творчасці Гётэ рэкамендуецца параўнаць жанрава-стылявыя рысы «Фаўста» Гётэ і купалаўскіх драматычных паэмаў «Адвечная песня» і «Сон на кургане». Гэты дослед пераконвае і іх у правільнасці сцвярджэння даследчыка Івана Навуменкі, што, «ствараючы свае драматызаваныя паэмы, Купала ішоў ад “высокіх” пачуццяў, ад узроўняў класічных трагедый, якімі з’яўляецца, напрыклад, бессмяротныя “Гамлет” Шэкспіра і “Фаўст” Гётэ».

Знаёмяцца студэнты і з меркаваннямі другога вядомага беларускага літаратуразнаўцы Алега Лойкі, які робіць цікавыя тыпалагічныя назіранні над паэтыкай паэмаў «Герман і Доратэя» Гётэ і «Яна і Я» Купалы. У працэсе працы студэнты самастойна адзначаюць жанрава-стылявое падабенства паміж гэтымі творамі. Цікавасць у студэнтаў выклікае параўнальная характарыстыка наватарства Кнута Гамсуна ў рамане «Вікторыя», дзе аўтар паказвае праблему сутыкнення характараў у каханні (а не абставінаў, як у іншых творах) і трансфармацыю гэтага наватарства на нацыянальнай глебе ў творы Міхася Зарэцкага «Ой ляцелі гусі…».

Пры вывучэнні рамана М. Зарэцкага «Вязьмо» было рэкамендавана правесці яго параўнальны аналіз з раманам М. Шолахава «Поднятая целина». Цікава, што студэнты ў самастойнай працы падсвядома скарысталі розны падыход да сістэмы каштоўнасцей: у 6-й групе II курса факультэта ВСіП увага была звернута на тыпалогію характараў галоўных герояў (выкарыстана арыенціровачная функцыя, пры якой увага ўдзяляецца вызначэнню месца асобы ў пэўнай сітуацыі, выбару пэўнай лініі паводзінаў); студэнты 5-й групы звярнулі ўвагу на тыпалогію абставінаў у кожным з раманаў і паказалі ментальныя асаблівасці стваральнікаў гэтых «сітуацый», прымяніўшы ацэначна-матываваную функцыю (уменне ацэньваць сітуацыю, матываваць, абгрунтоўваць свае выказванні, адстойваць зробленыя вывады); студэнты 7-й групы праявілі сябе як сапраўдныя будучыя рэдактары, бо разглядалі не агульныя, а чыста прафесійныя пытанні: яны напісалі на творы Зарэцкага і Шолахава рэдактарскія заключэнні. У іх увага была нададзена аналізу жанрава-стылявых асаблівасцяў і мовы рамана. Такім чынам, падсвядома была скарыстана прагнастычная функцыя (выпрацоўка навыкаў па дасягненню пастаўленых мэтаў, набыццю новых каштоўнасцей, іх прагназаванню на перспектыву).

Адно з асноўных палажэнняў канцэпцыі літаратурнай адукацыі – арыентацыя на нацыя-

нальныя і агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці. Прыярытэт агульначалавечых ісцін мае на ўвазе пазбаўленне ад сацыялагічнага дагматызму і ідэалагічнай зададзенасці ў вывучэнні літаратуры. Адыход ад празмернай ідэалагізацыі літаратурнай адукацыі павінен праяўляцца не толькі ў абнаўленні зместу, але і ў практыцы аналізу мастацкіх твораў.

Сучасная канцэпцыя літаратурнай адукацыі прадугледжвае параўнальны аналіз з аналагічнымі працэсамі і з'явамі ў сусветнай літаратуры. Напрыклад, аналіз рамана Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» падаецца ў параўнанні з раманам чэшскага пісьменніка Яраслава Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў час сусветнай вайны», п'есай французскага драматурга, аднаго з заснавальнікаў мадэрнісцкага «тэатра абсурду» Эжэна Іанескі «Насарог» і п'есай Самуэла Бекета «У чаканні Гадо», а драматургія Францішка Аляхновіча (яго «новая драма») разглядаецца ў кантэксце творчасці такіх знакамітых майстроў драматургічнага жанру, як Генрык Ібсэн, Марыс Метэрлінк, Бернард Шоу, Герхарт Гаўптман, Юхан Аўгуст Стындберг.

Параўнальнае літаратуразнаўства ўзнікла ў XIX ст. Гэта аналітычнае апісанне, метадычнае і дыферэнцыйнае параўнанне, сінтэтычная інтэрпрэтацыя міжмоўных і міжкультурных літаратурных феноменаў пры дапамозе гісторыі, крытыкі і філасофіі, эстэтыкі, стылістыкі тэксту з мэтай лепей зразумець літаратуру як спецыфічную функцыю чалавечай свядомасці.

Галоўная асаблівасць новага падыходу да методыкі выкладання літаратуры заключаецца ў тым, што аналіз мастацкага твора становіцца актам пошуку ісціны. Студэнты з дапамогай выкладчыка прасочваюць аўтарскую пазіцыю, адкрываюць у мастацкім творы сугучныя думкі, знаходзяць у ім асабіста значымы сэнс. У працэсе аналізу мастацкага тэксту студэнты павінны ўмець самастойна вызначаць эстэтычную вартасць твора, што спрыяе актыўнай выпрацоўцы ўласнай жыццёвай пазіцыі. Параўнальнае літаратуразнаўства дае магчымасць больш шырокага выяўлення кампетэнтнасці студэнта, паскарае працэс фармавання асобы, бо веданне тэарэтычных паняццяў становіцца гарантам глыбокага спасціжэння вобразнай мадэлі рэчаіснасці, твораў, іх спецыфічных рыс.

Глыбокае ўсведамленне анталагічнага базісу чалавечай свядомасці ўвогуле закладвае аснову свядомага фармавання асобы ўжо на пачатковым этапе, стварае неабходныя ўмовы для працэсу пазнання ў агульнафіласофскім і педагагічным, псіхалагічным, дыдактычна-навучальным плане. Бо студэнты спачатку павінны ведаць, што яны вывучаюць, а затым ісці шляхам пазнання мастацтва на гэтай аснове. Такім чынам, пры ажыццяўленні навучальнага (пазнавальнага) працэсу неабходна дасягаць разумення рэцыпіентамі анталагічнай (самай сутнаснай, «быццёвай», прадметнай) асновы мастацтва, літаратуры, культуры з мэтай, каб яны пазней, творачы свой ці асэнсоўваючы чужы новы свет (вобразнае іншабыццё ў слове), параўноўвалі, яго з аб'ектыўным, рэальным светам.

Калі сказаць прасцей, то пры ўключэнні працэдуры параўнання твораў студэнт не зможа прадуктыўна працаваць, калі папярэдне не азнаёміцца з тэкстам, бо пераказванне крытычных матэрыялаў, як было раней, не выратуе становішча, калі на практычных занятках ідзе актыўнае абмеркаванне філасофскай, эстэтычнай ці вобразнай сутнасці твора. Такім чынам, арыентаванасць сучаснай методыкі на мастацкі тэкст як на вяршыню ў вывучэнні сродкаў яго выяўлення падвышае яго дыялагічную ўнутраную сутнасць.

Напрыклад, каб наглядна паказаць сутнасць кангеніяльнасці (супадзення) творчай парадыгмы таго ці іншага аўтара, што бывае даволі часта, варта звярнуць увагу студэнтаў на тыпалогію творчых варункаў Язэпа Пушчы і Сяргея Ясеніна. Бо, на нашу думку, зацікавіўшыся праблемай іншай свядомасці, уласнага «Я» свайго куміра, з якога малады беларускі паэт ствараў свой імідж, Пушча, можа і не разумеючы таго сам, прымяніў герменеўтычную працэдуру: ён пранікнёна ўвайшоў у духоўны свет Ясеніна, зразумеў яго пачуцці і думкі, таму творчая свядомасць рускага паэта гасцінна адчынілася яму, узнікла пэўная кангеніяльнасць эмацыянальнага і духоўнага стану беларускага і рускага паэтаў. Асабліва гэта прасочваецца ў ранніх вершах абодвух творцаў прыгожага слоўнага мастацтва.

На параўнанні творчасці гэтых выбітных паэтаў можна паказаць таксама шматаспектны аналіз моўных асаблівасцяў, не замяняючы іх тыпова-стандартнымі, прыдатнымі для ўсіх відаў і жанраў характарыстыкамі-схемамі. Таму заданне павінна быць канкрэтным, цікавым і адмысловым. Бо можна ахарактарызаваць выяўленчыя сродкі мастацкага твора па «старой» схеме (агульна пералічыць эпітэты), а можна падвесці студэнта да самастойнага асэнсавання праблемы і творчага вырашэння пастаўленай задачы праз уважлівае прачытанне тэксту і падрабязную характарыстыку яго адметнасцяў.

Скажам, студэнты атрымалі заданне не проста вызначыць эпітэты ў творчасці Ясеніна і Пушчы, а прааналізаваць іх сутнасць. Цэнтральным звяном разважанняў стала выяўленне вобразнай спецыфікі мастацкага тэксту. Адсюль выцякае лагічная выснова пошуку асноўных вобразаў, з якімі знітаваны самыя распаўсюджаныя эпітэты. Пры пільным прачытанні вершаваных тэкстаў студэнты правільна

адзначылі, што ў Пушчы сакавітыя вобразы раніцы знітаваны ў адзінае цэлае глыбіннымі ўнутранымі сувязямі, а ў Ясеніна яны прасякаюць памежжа вечара і ночы, калі ад луннага святла ўсё становіцца ірэальным. Відавочна, у Ясеніна пераважае сіні колер, які сімвалізуе адчужэнне, згасанне. У панарамным вобразе вечара і ночы яно і апраўдана. Бо менавіта луна надае прадметам пэўную ненатуральнасць. Пластыка каляровай гамы робіць паэтычныя вобразы загадкава-застылымі, задуменнымі, чароўнымі, але нежывымі. Не дзіўна, што сіні колер выступае і як знак смерці. Гэту думку аўтар пацвярджае вершам «Исповедь хулигана», дзе адкрыта заяўляе: «Синий свет, свет такой синий! / В эту синь даже умереть не жаль» [1, с. 262].

Беларускі мастак прыгожага слова тонка адчуваў настрой свайго куміра, перададзены праз колер, бо з Ясеніным яго яднала разуменне таго, што прырода – гэта вечная прыгажосць і вечная гармонія сусвету. Але пластыка вобразаў у яго была свая. Мо таму і сіні колер больш стваральны, эмацыйна набліжаны да насычанача зялёнага. Таму азначае ён то прадвесне, а значыць квітненне зямлі («Раніца / Ў полі рыкае / У зялёную сінь», то памежжа ночы і раніцы, калі сонца, як заліхвацкі пастух, «на сіні выган выганяе» пасвіць дзень. Паэт прызнаецца, што яго песням лепш «Карагодзіць вясны сінякудры ўзвыш». А ў вершы-акварэлі «Надранне», у якім асноўнае месца займаюць выразныя зрокавыя, пластычныя замалёўкі, памастацку паказаўшы змену прыроднай фармацыі (памежжа ночы і раніцы), калі яшчэ «Лес яловы / галаву палошча ў сіні», а кусты «ловяць хваляў срэбных пырскі», Пушча дазваляе сонцу рашуча расправіцца са свяшчэннадзейнасцю ночы, знішчыўшы сіні колер як нешта зусім непатрэбнае і нават небяспечнае:

Сонца ж змрокі
Б'е на раны
І змятае колер сіні
Памялом пунцовай рані [1, с. 262].

Пры такім аналізе студэнт спакваля разумее важнасць ролі тэксту як эстэтычнага сродку апасродкаванай камунікацыі, галоўная мэта якой – вобразна-выяўленчае раскрыццё тэмы, пададзенай у адзінстве формы і зместу. Разумее ён і тое, што тэкст застаннецца «мёртвым без акта спазнання», а ў навучальным дыялогу ён «ажыве». І ўдзельнікам падобнай метамарфозы можа стаць непасрэдна ён, студэнт-выдавец, бо і дальнейшая ягоная праца будзе звязана з тэкстам. Няхай сабе і не мастацкім. Значыць, тэкст трэба вучыцца разумець... Ці будзе ён цяпер ігнараваць тэкст твора, замяняючы яго выняткамі з крытычных артыкулаў і падручнікаў? Не. Ён, як творчая асоба, падмацуе імі тэкст. І такая схема спрацоўвае безадказна. Бо 80% студэнтаў, калі прааналізаваць вынікі іх творчай працы (удзел у рэспубліканскіх выставах, конкурсах, рэспубліканскіх і Міжнародных навуковых канферэнцыях, дзейнасці гуртка паглыбленага вывучэння літаратуры «Спадчына»), паспяхова авалодваюць прадметам і атрымліваюць выдатныя адзнакі ў час экзаменацыйнай сесіі.

Пры дадзенай методыцы вывучэння літаратуры задача выкладчыка – акрэсліць шлях навуковага пазнання студэнтаў-выдаўцоў цэласнага ўяўлення аўтарскай канцэпцыі, літаратуразнаўчых і філасофскіх паняццяў праз акты адчування, успрымання, суперажывання. Рух да выпрацоўкі паняццяў – гэта рух навуковага мыслення. Пры вобразным мысленні паняцце ператвараецца ў вобраз.

Пашырэнне навуковай кампетэнцыі будучага выдаўца хутка прывядзе да інтэлектуальнага ўзбагачэння асобы студэнта, зацікавіць яго пошукам сутнасных заканамернасцяў жыцця, адаб'ецца на фарміраванні светапогляду, які стане больш шырокім і засяроджаным на вызначальных каштоўнасцях жыцця і будзе ў такім выпадку фарміравацца не стыхійна, а эвалюцыйна.

Ці ўсім студэнтам спрыяе пошукавая і аналітычная праца? У аднолькавай меры не. Але ж ёсць і рознаўзроўневыя заданні, і індывідуальная праца са студэнтамі, і ўзаемадапамога пры выкананні агульнага задання, а таксама дыскусіі і дэбаты, калі высвятляюцца спрэчныя пытанні з самага нечаканага боку, і многія іншыя педагагічныя прыёмы, якія дапамагаюць прывіць студэнтам імкненне да самараскрыцця і самарэалізацыі асобасных творчых пачаткаў.

**Літаратура**

1. Есенин, С. А. Собрание сочинений: в 2 т. / С. А. Есенин. – Минск, 1992. – Т. 1: Стихотворения, поэмы, артикулы.

2. Пушча, Я. Збор твораў: у 2 т. / Я. Пушча. – Мінск, 1993. – Т. 1: Вершы, паэмы. – 1922–1930.